**Библиографические ссылки:**

1. Бортницкий А.И. Этапы становления и развития Республиканской психиатрической больницы в Новинках / А.И. Бортницкий // Научно-практическая конференция врачей Республиканской психиатрической больницы. Минск: Полымя, 1972. С. 3-13.
2. Высоцкий В.С. Дельфины и психи. Записки сумасшедшего, или Жизнь без сна / В.С. Высоцкий [Электронный ресурс]. URL: http://vysotskiy-lit.ru/vysotskiy/proza/delfiny-i-psihi.htm.
3. Высоцкий В.С. Песне о сумасшедшем доме / В.С. Высоцкий [Электронный ресурс]. URL: http://vysotskiy-lit.ru/vysotskiy/stihi/113.htm.
4. Высоцкий В.С. Я лежу в изоляторе / В.С. Высоцкий [Электронный ресурс]. URL: http://vysotskiy-lit.ru/vysotskiy/stihi/277.htm.
5. Гиляровский В. А. Психиатрия. Руководство для врачей и студентов / В.А. Гиляровский. Л.-М.: Биомедгиз. 16 тип. треста «Полиграфкнига» в Мск., 1935. – 750 с.
6. Горбачев, А. Ю. Владимир Высоцкий, последний романтик советской эпохи / А.Ю. Горбачев // Русская литература XX - начала XXI века: избранные имена и страницы. Минск: ТетраСистемс, 2011 . С. 174-194.
7. ГУ Республиканский научно-практический центр психического здоровья [Электронный ресурс]. URL: https://www.mentalhealth.by/uslugi/platnye-uslugi
8. Живая жизнь: штрихи к биогр. Владимира Высоцкого: [сборник]. [Кн. 1] / [интервью и лит. запись В.К. Перевозчикова]. М.: Моск. рабочий, 1988. – 316 с.
9. Инструкцию по неотложной госпитализации психически больных, представляющих общественную опасность, от 10 октября 1961 г. // Бюллетень текущего законодательства СССР, январь, 1968 г.
10. Инструкция о порядке назначения и проведения принудительного лечения психически больным, совершившим преступление / Инструкция Народного комиссариата Здравоохранения РСФСР и народного Комиссариата юстиции РСФСР. 1935. 23 с.
11. Инструкция о приёме душевнобольных в психиатрические учреждения и выписка из них. 1.11.1922 г. // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Ф. 464. Оп. 1а, Д. 244.
12. Манкевич И.А. Литературно-художественное наследие как источник культурологической информации / И.А. Манкевич // Обсерватория культуры. 2007, № 5. С.17–23.
13. Мелешко Л.С. Первая в Белоруссии женщина-психиатр, рукопись / Л.С. Мелешко. Из личного архива автора.
14. Муратова И.Д. История развития психиатрической службы на Севере / официальный сайт Государственного бюджетного учреждения здравоохранения Архангельской области «Архангельская клиническая психиатрическая больница». URL: http://www.talagi.ru/index.php.
15. Перепелкин М.А. Трое в сумасшедшем доме (В.С. Высоцкий, И.А. Бродский, В.В. Ерофеев) // Владимир Высоцкий: исследования и материалы 2015-2016 гг.: сборник научных трудов. М., 2016. С. 54-70.
16. Современный философский словарь. – [СПб.]: Академический проект, 2004. – 864 с.
17. Geschichte der Psychiatrie in der LVR-Klinik Boon // Psychiatrie Museum Ver.rückte Zeiten im Haus 15 der LVR-Klinik Boon. Boon, 2018.

УДК 94(476)”1861/1914”:930 +352.075(476)(091):930

# ПАВЯТОВАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1861-1914 ГГ.: СУЧАСНАЯ АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

**А. Р. Лудзіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; aludich@mail.by*

Зроблены агляд сучаснай айчыннай гістарыяграфіі па праблеме дзейнасці павятовай адміністрацыі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Разгледжаны асноўныя працы па даследаванні мясцовага дзяржаўнага апарату з 1991 г. Асвячаюцца ідэі аўтараў даследаванняў, зроблена спроба вызначыць значэнне прааналізаваных прац для наступнага вывучэння пытання. Вызначаны прабелы ў вывучэнні тэмы павятовых

дзяржаўных устаноў у айчыннай гістарыяграфіі. Выяўлена спецыфіка гістарычнай літаратуры сучаснага перыяду.

***Ключавыя словы:*** гістарыяграфія; гістарычныя даследаванні; павятовая адміністрацыя; мясцовыя органы ўлады; беларускія губерні.

## УЕЗДНАЯ АДМИНИСТРАЦИЯ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1861-1914 ГГ.: СОВРЕМЕННАЯ ОТЕЧЕСТВЕННАЯ ИСТОРИОГРАФИЯ

**А.Р. Лудич**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь;* aludich@mail.by

Сделан обзор современной отечественной историографии по проблеме деятельности уездной администрации на территории Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. Рассмотрены основные работы по исследованию местного государственного аппарата с 1991 г., освещаются идеи авторов исследований, сделана попытка определить значение проанализированных работ для дальнейшего изучения вопроса. Определены пробелы в изучении темы уездных государственных учреждений в отечественной историографии. Выявлена специфика исторической литературы современного периода.

***Ключевые слова:*** историография; исторические исследования; уездная администрация; местные органы власти; белорусские губернии.

## THE DISTRICT ADMINISTRATION ON THE TERRITORY OF BELARUS DURING THE YEARS 1861-1914: MODERN BELARUSIAN HISTORIOGRAPHY

**A. R. Ludzich**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus;* aludich@mail.by

The article is dedicated to overview of contemporary Belarusian historiography on the problem of the activities of County administrations on the territory of Belarus in the second half of XIX – early XX century are Considered the basic work for the study of the local state apparatus since 1991 sanctified ideas of the authors of the studies attempt to determine the value of the works analysed for further study of the issue. Gaps in the study of the theme of County state institutions in the national historiography are identified. The specificity of historical literature of the modern period is revealed.

***Key words:*** historiography; historical research; County administration; local authorities; Belarusian provinces.

У выніку лібералізацыі грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 1980 – пачатку 1990-х гг. пачаліся пошукі новых метадалагічных падыходаў у вывучэнні гісторыі беларускай дзяржаўнасці, істотна пашырылася поле даследаванняў, прысвечаных станаўленню і развіццю мясцовага кіравання і бюракратыі. Гісторыкі звярнуліся ўвагу на неабходнасць разглядаць мінулае Беларусі з пункту гледжання развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці. Эвалюцыя сучасных інстытутаў улады ў Беларусі паспрыяла павелічэнню зацікаўленасці айчынных гісторыкаў і юрыстаў-прававедаў да вывучэння адміністрацыйнага апарату кіравання парэформеннага перыяду.

Першай спробай новага пераасэнсавання дзяржаўнай сістэмы кіравання ў Беларусі можна лічыць калектыўнае двухтомнае выданне «Нарысы гісторыі Беларусі», падрыхтаванае супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. На думку аўтараў, мясцовыя дзяржаўныя ўстановы функцыянавалі «з мэтай надання краю “истинно русского” аблічча, выкаранення гістарычнай памяці, нацыянальнай свядомасці і ўсіх этнічных асаблівасцей беларусаў» [1, с. 334]. Але праблема функцыянавання мясцовай адміністрацыі ў дадзенай працы была раскрыта даволі павярхоўна. Фарміраванне і функцыянаванне органаў павятовага кіравання знайшлі сваё адлюстраванне ў калектыўнай працы «Гісторыя Беларусі» (у 6 тамах, т. 4) [2]. Негатыўны погляд на фарміраванне мясцовага адміністрацыйнага апарату пасля паўстання 1863–1864 гг. выказаў З. В. Шыбека ў абагульняючым даследаванні «Нарыс гісторыі Беларусі» [3]. На яго думку, Беларусь запаўнялася вялікарускімі бюракратамі, якія ў «…варожым акружэнні ад тугі бязбожна пілі і гулялі ў карты. Квітнела хабарніцтва. Багацеі маглі купіць сабе любую пастанову мясцовай

адміністрацыі… Руская адміністрацыя запанавала ў губернскіх і павятовых цэнтрах» [3, с. 102–103].

На сучасным этапе беларускімі даследчыкамі было падрыхтавана некалькі навуковых прац, якія ў цэлым характарызавалі сістэму кіравання беларускімі землямі ў складзе Расійскай імперыі. З такіх даследаванняў важна ўзгадаць дысертацыю С. М. Токця «Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30–60-х гг. XIX ст. (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус)» [4]. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі высновы аб складзе чыноўніцтва былі пабудаваны на масавых крыніцах. Дадзеная праца ўтрымлівае аналіз фармулярных спісаў 374 чыноўнікаў ад дваранства Мінскай губерні, 281 і 246 спісаў служачых губернскага кіравання, паліцыі і павятовых судоў Гродзенскай губерні за 1857 і 1869 гг. суадносна. Вельмі карысным з’яўляецца навуковы аналіз звестак складу чыноўніцтва адносна яго саслоўнай і канфесійнай структуры, маёмаснага становішча, узроўню адукацыі і геаграфічнага паходжання. У працы даецца структурная арганізацыя, механізм функцыянавання мясцовых органаў, а таксама характар іх узаемадзеяння з урадавымі бюракратычнымі ўстановамі. Прааналізавана кадравая палітыка ўрада адносна прызначэння чыноўнікаў на службовыя пасады пасля паўстання 1863–1864 гг.

А. Ф. Сві́б у працы «Государственно-правовой статус Беларуси в составе России в пореформенный период (1861–1900)» зрабіла выснову аб тым, што мясцовыя органы ўлады на беларускіх землях мелі значную кампетэнцыю, у тым ліку і па рэалізацыі мерапрыемстваў палітыкі ўраду [5]. С. Ф. Шымуковіч даў характарыстыку вертыкалі кіравання губернямі, выдзеліў ролю генерал-губернатара і губернатара ў кіраванні беларускімі землямі, абазначыў асноўныя накірункі кадравай палітыкі пасля паўстання 1863–1864 гг. [6].

З сучаснай беларускай гістарыяграфіі па праблеме сістэмы кіравання беларускімі губернямі неабходна выдзеліць манаграфію А. А. Кісялёва [7]. Даследчык дае разгорнутую характарыстыку становішчу чыноўніцтва ў канцы XVIII – першай палове XIX ст., характарызуе сістэму кіравання пры кожным з імператараў, а таксама аналізуе асабовы склад чыноўнікаў. Аўтар прасачыў змены ў заканадаўстве для пяці беларускіх губерняў, даследаваў багаты фактычны матэрыял для аналізу складу чыноўнікаў, выкарыстоўваючы фармулярныя спісы. Дысертацыя А. А. Падарожняй «Местные органы государственной власти и управления в Беларуси (1861–1914 гг.): структура, функции, кадры» з’яўляецца спробай скласці агульную карціну сістэмы губернскіх і павятовых устаноў, разгледзець сферу іх дзейнасці і асабовы склад [8]. Даследчыца дала паказала працэс эвалюцыі органаў кіравання і самакіравання пад уплывам асобага палітычнага статусу беларускага краю.

Асобай увагай беларускіх даследчыкаў карысталася тэма кадравай палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі. А. Ф. Смалянчук характарызуе накірункі кадравай палітыкі, у тым ліку ў дачыненні чыноўнікаў-католікаў [9]. Гісторык прыходзіць да высновы аб непаслядоўнасці палітыкі русіфікацыі, якая была накіравана на «абсалютнае дамінаванне “великорусского элемента” не толькі ў палітычным, але і нацыянальна-культурным жыцці» [9, с. 362]. Працягам вывучэння пытанняў адміністрацыйна-кадравай палітыкі самадзяржаўя на Беларусі стаў артыкул Н. А. Роцькі, дзе разглядаюцца змены ў чыноўніцкім складзе ў 1860–1890-ыя гг. [10]. В. І. Якаўчук выдзеліў асноўныя накірункі палітыкі ўлад па замяшчэнню пасад рускімі чыноўнікамі ў краі [11]. Асобныя пытанні фарміравання складу мясцовай адміністрацыі знайшлі сваё адлюстраванне ў даследаваннях С. Л. Лугаўцовай [12].

Сучасная айчынная гістарыяграфія прадстаўлена як адмысловымі працамі, прысвечанымі вывучэнню асобных мясцовых інстытутаў дзяржаўнага кіравання, так і шэрагам кандыдацкіх дысертацый. Праблеме арганізацыі паліцэйскіх органаў на беларускіх землях прысвечана праца В. Шалкапляс «Карательный аппарат России во второй половине XIX века» [13]. Дзейнасць Дэпартамента паліцыі ў беларускіх губернях у другой палове XIX ст. вывучаў у сваёй кандыдацкай дысертацыі А. Д. Гронскі [14]. С. І. Бусько даследаваў структуру і кадравы склад жандармскіх упраўленняў, умовы паступлення і праходжання службы афіцэрамі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. [15]. А. А. Кісялеў праводзіць вывучэнне

структуры і эвалюцыі паліцэйскіх органаў, разглядае кадравую палітыку па прызначэнню на пасады ў мясцовыя ўстановы, дае харктарыстыку асабоваму складу служачых Міністэрства ўнутраных спраў. На старонках яго публікацый аналізуецца дзейнасць павятовых паліцэйскіх упраўленняў у беларускіх губернях у другой палове XIX – напачатку XX ст. [16].

Станаўленне мясцовых судзебных органаў не засталося па-за межамі даследаванняў беларускіх гісторыкаў. Дысертацыя А. У. Марыскіна прысвечана рэалізацыі судзебнай рэформы 1864 г. у беларускім краі [17]. Праблему заканадаўчага афармлення і арганізацыі міравога суда на тэрыторыі Беларусі разглядаў у серыі публікацый А. А. Загорнаў [18]. Ролі судоў у палітычным жыцці і сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ў парэформенны перыяд прысвечана дысертацыя І. Г. Гушчынскага [19]. Судзебныя функцыі земскіх начальнікаў былі ахарактарызаваны ў даследаваннях Г. А. Стралені [20].

Сучаснымі беларускімі даследчыкамі было прадоўжана вывучэнне арганізацыі і функцыянавання мясцовых сялянскіх устаноў. У калектыўнай працы «Гісторыя сялянства Беларусі» (2-гі т.) раскрываецца арганізацыя мясцовых устаноў па рэалізацыі рэформы 1861 г. і сталыпінскай аграрнай рэформы: міравых пасрэднікаў, павятовых праверачных камісій, прысутнасцей па сялянскіх справах, павятовых землеўпарадкавальных камісій [21]. Праца была напісана на аснове класавага падыходу, таму дзейнасць павятовых сялянскіх органаў ацэньваецца негатыўна, бо яны «…ігнаравалі інтарэсы сялян на карысць паменснага дваранства… некаторыя з іх і адабрэння праверачных камісій і міравых устаноў праводзілі новыя захопы сялянскіх угоддзяў» [21, с. 119].

На сённяшні дзень адным з вядучых спецыялістаў у даследаванні дзейнасці сялянскіх інстытутаў кіравання і самакіравання ў парэформенны перыяд у Беларусі з'яўляецца С. А. Талмачова. У яе манаграфіі «Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)» разглядаюцца праблемы стварэння і дзейнасці шэрагу губернскіх і павятовых органаў кіравання [22]. Дзейнасць інстытута міравых пасрэднікаў была накіравана не толькі на практычнае ажыццяўленне палажэнняў 19 лютага 1861 г., але і на кантроль над сялянскім самакіраваннем. У манаграфіі адзначаецца рэарганізацыя сялянскіх інстытутаў кіравання па Палажэнню ад 27 лютага 1874 г., згодна з якім былі створаны павятовыя прысутнасці па сялянскіх справах. У полі вывучэння даследчыцы апынуліся пытанні, звязаныя з утварэннем і дзейнасцю земскіх начальнікаў. Роля павятовых землеўпарадкавальных камісій у ажыццяўленні сталыпінскай аграрнай рэформы вывучана К. Ю. Тарановіч [23]. Г. А. Страленя паказала асаблівасці ўвядзення інстытута земскіх начальнікаў у беларускіх губернях, ахарактарызавала працэс фарміравання новага органа ўлады. На прыкладзе трох беларускіх губерняў прааналізавана саслоўная і канфесійная прыналежнасць, адукацыйны ўзровень земскіх начальнікаў. Пасля чаго даследчыца зрабіла выснову аб залежнасці фарміравання інстытута земскіх начальнікаў ад пастаўленных самадзяржаўем задач ў нацыяльна-культурнай сферы [20].

Дзяржаўная служба дваранства, яго карпаратыўная арганізацыя і ўрадавая палітыка па дачыненні да інстытута павятовых прадвадзіцеляў дваранства разглядаецца ў манаграфіі А. П. Жытко «Дваранства Беларусі перыяду капіталізму, 1861–1914 гг.» [24]. Аўтар прыйшоў да высновы, што ўдзельная вага дваран сярод чыноўнікаў у паслярэформенны перыяд паступова скарачалася. Самадзяржаўе праводзіла палітыку адхілення дваран каталіцкага веравызнання ад дзяржаўнай службы ў Беларусі. У. П. Слабажанін, аналізуючы праблему земскага самакіравання, зрабіў істотныя высновы па пытаннях правядзення рэформ самакіравання, узаемаадносін органаў дзяржаўнага кіравання і гарадскога самакіравання [25]. Н. С. Маторава адзначыла, што сістэма земскага самакіравання на тэрыторыі беларускіх губерняў не адрознівалася ад унутрырасійскіх губерняў [26].

Тэма дзейнасці адміністрацыйнага апарату заняла значнае месца ў даследаваннях па сацыяльна-палітычнай гісторыі Беларусі. А. Г. Каханоўскі ў манаграфіі «Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)»

разглядае ўмовы паступлення на службу для розных сацыяльных груп, перавагі службы ў беларускіх губернях, характарызуе нацыянальны склад чыноўніцтва ў адпаведнасці з данымі перапісу насельніцтва 1897 г., разважае над месцам чыноўніцтва ў структуры занятасці насельніцтва [27]. Аўтар прыходзіць да высновы, што чыноўніцкі корпус вызначаўся сваёй стракатасцю, яго склад напрамую залежыў ад рэалізацыі задач урадавай палітыкі, аднак адукацыйны цэнз і прафесіяналізацыя дзейнасці пастурова аказвалі ўсё большы ўплыў на яго фарміраванне.

У апошні час значны ўклад у вывучэнне адміністрацыйнага апарату беларускіх губерняў у другой палове XIX – пачатку XX ст. унёс А. Д. Кузьмін. Даследчык у манаграфіі «Социокультурный облик чиновничества белорусских губерний (1864–1914 г.)» раскрывае пытанні паўсядзённага жыцця чыноўнікаў беларускага краю ў 1864–1914 гг. [28]. Аўтар прыходзіць да высновы, што паўсядзённы быт чыноўнікаў вызначаўся ўзроўнем даходу, сацыяльным паходжаннем, пасадай, сямейным становішчам і месцам пражывання. Аўтар прааналізаваў асаблівасці карпаратыўнай этыкі дзяржаўных служачых і праблемы ўзаемадзеяння з іншымі сацыяльнымі групамі, правёў аналіз ладу жыцця.

Значным укладам у распрацоўку праблемы гісторыі мясцовых дзяржаўных устаноў з'явіліся даведачныя зборнікі, падрыхтаваныя супрацоўнікамі БелНДІДАС аб мясцовых органах улады ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях [29; 30; 31]. Аўтарамі на аснове аналізу заканадаўчых нормаў і архіўнага матэрыялу была ажыццёўлена спроба прадставіць структуру больш за 300 дзяржаўных, рэлігійных і грамадскіх устаноў у межах губерні з указаннем месца іх стварэння і ліквідацыі, функцый, структуры і штатнага складу. Недахопам дадзеных прац з'яўляюцца некаторыя фактычныя памылкі.

Даследуемая праблема знайшла сваё адлюстраванне і ў шэрагу калектыўных прац беларускіх даследчыкаў: «Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг.», другі том «Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в.)» са шматтомнага выдання «История белорусской государственности» [32; 33]. Аўтары паставілі за мэту прааналізаваць эвалюцыю шэрагу мясцовых дзяржаўных інстытутаў: павятовая паліцыя, міравыя пасрэднікі, прысутнасці па сялянскіх справах, земскія начальнікі, казённая палата, падатковыя камісіі, землеўпарадкавальныя камісіі, міравыя суды, інстытут прадвадзіцеляў дваранства, земскія ўстановы і інш. Пералічаныя органы мясцовага кіравання разглядаюцца выбарачна, паасобку і няпоўна, што не дазваляе казаць аб комплексным аналізе праблемы.

Такім чынам, на сучасным этапе ў айчыннай гістарыяграфіі можна адзначыць паглыбленне інтарэсу да дзейнасці ўстаноў павятовага ўзроўню і мясцовага чыноўніцтва. Сярод беларускіх даследчыкаў актыўна працягваецца вывучэнне сістэмы органаў дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Беларусі. Аднак абагульняючая карціна фарміравання і эвалюцыі органаў улады на павятовым узроўні не створана, ёсць толькі група тэматычна, храналагічна і метадалагічна раз'яднаных даследаванняў. Аб'ём даследаванняў, прысвечаных дзейнасці павятовага чыноўніцтва, дастаткова невялікі. Асобныя сюжэты мясцовага дзяржаўнага кіравання знайшлі месца ў працах, якія прысвечаны працэсам мадэрнізацыі, сацыяльна-эканамічнай гісторыі, палітыцы самадзяржаўя ў краі і г.д. Між тым даследчыкам розных школ і эпох удалося падрыхтаваць багаты і каштоўны матэрыял. Але, нягледзячы на накоплены досвед у вывучэнні сістэмы дзяржаўнага кіравання, тэма дзейнасці павятовай адміністрацыі так і не стала аб'ектам спецыяльнага даследавання.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2-х ч. / М. П. Касцюк [і інш.] ; Акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі ; [рэдкалегія: М. П. Касцюк і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994-1995. Ч. 1. 1994. – 527 с.
2. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі. (канец XVIII – пачатак XIX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч і інш.; Рэдкал.: М. Касцюк [гал. рэдактар] і інш. Мінск : Экаперспектыва, 2007. – 519 с.

3. Шыбека, З. В. Нарыс гісторыі Беларусі, 1795-2002 / Захар Шыбека. Мінск : Энцыклапедыкс, 2003. – 489 с.
4. Токць, С. М. Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30–60-х гг. XIX ст. (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус) : дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / С.М. Токць. Мінск, 1997. – 150 с.
5. Свиб, А. Ф. Государственно-правовой статус Белоруссии в составе России в пореформенный период (1861-1900) / А. Ф. Свиб. Минск: БИП-С, 2004. – 120 с.
6. Шимукович, С. Ф. История Беларуси. Эволюция органов государственного управления : пособие / С. Ф. Шимукович. Минск : Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2007. – 90 с.
7. Киселев А.А. Система управления и чиновничество белоруских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в. / А.А. Киселев. Минск: Военная Академия Республики Беларусь, 2007. – 171 с
8. Подорожняя, Е. А. Местные органы государственной власти и управления в Беларуси (1861-1914 гг.) : структура, функции, кадры : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Е. А. Подорожняя. Минск, 2014 г. – 180 л.
9. Смалянчук, А.Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864-1917 / А.Ф. Смалянчук Гродна: ГрДУ, 2001. - 322 с.
10. Роцька, Н. А. Змены ў становішчы чыноўніцтва Беларусі (60-90-я гг. XIX ст.) / Н. А. Роцька // Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. 2002, №2. С. 7-11.
11. Якаўчук, В. І. Фарміраванне дзяржаўнага апарату ў заходніх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. / В. І. Якаўчук // Веснік БДПУ. Серыя 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. 2009, № 2. С. 29-33.
12. Луговцова, С. Л. Мероприятия российских властей по формированию состава государственных учреждений белорусских губерний в 1850-1860-е гг. / С. Л. Луговцова // Гуманитарно-экономический вестник. Минск : Международный гуманитарно-экономический институт, 2015. №1. С. 43-48.
13. Шелкопляс, В. А. Карательный аппарат России во второй половине XIX века : учеб. пособ. для студ. юрид. спец. вузов/ В.А. Шелкопляс ; Академия МВД. Минск, 1994. 130 с.
14. Гронский, А. Д. Политическая полиция Российской империи и её деятельность на территории Беларуси во второй четверти XIX – начале XX в: дис. … канд. ист. наук: 07.00.03, 07.00.02/ А. Д. Гронский. Минск, 2003. – 115 с.
15. Бусько, С. И. Структура и кадровый состав губернских жандармских управлений на территории Беларуси (конец XIX – начало XX в.)/ С. И. Бусько. – Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 5/ рэдкал.: У.К. Коршук (адк. рэд). Мінск: БДУ, 2010 г. – С. 9-18.
16. Киселев, А. А. Уездная полиция белорусских губерний Российской империи в 60-х – первой половине 70-х гг. XIX в. / А.А. Киселев // Идеологические аспекты военной безопасности. 2012, №4. С. 60-64.
17. Марыскин, А. В. Судебная реформа 1864 года и особенности её проведения на территории Белоруссии : Автореф. дисс. на соиск учен. степ. канд. юр. наук : 12.00.01 / А. В. Марыскин – Всесоюз. юрид. заоч. ин-т. Москва, 1985. – 24 с.
18. Загорнов, А. А. Судебная реформа 1864 г. в Беларуси: законодательное оформление / А. А. Загорнов // Вестник Высшего Хозяйственного Суда Республики Беларусь. Минск: Дом прессы, 2010, №11. С. 176-181.
19. Гушчынскі, І. Г. Роля судовых устаноў у палітычным жыцці і сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі (1864-1914 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / І. Г. Гушчынскі. Мінск, 2011. – 160 л.
20. Страленя, А. А. Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец 10 – 1914 г.) : дисс. на соиск. уч. ст. канд. ист. наук : специальность 07.00.02 / А. А. Страленя. Минск, 2017 – 169 с.
21. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён. У 3 т. Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгауз, Х. Ю. Бейлькін, А. Р. Бухавец і інш.; Пад рэд. В. П. Панюціча. Мінск : Беларуская навука, 2002. – 552 с.
22. Талмачова, С. А. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі (1861-1914 гг.) / С. А. Талмачова. Мінск : БДПУ, 2019. – 344 с.
23. Таранович, К. Ю. Деятельность землеустроительных комиссий по реализации столыпинской аграрной реформы в Беларуси (1906-1917) : автореф. дисс. на соиск. уч. ст. канд. ист. наук : 07.00.02 / К. Ю. Таранович. Минск, 2016. – 27 с.

24. Жытко, А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму, 1861-1914 гг./ А.П. Жытко. Мінск: БДПУ, 2003. – 233 с.
25. Слобожанин, В. П. Земское самоуправление в Беларуси (1905-11917 гг.) / В. П. Слобожанин. Минск : Право и экономика, 2003. – 166 с.
26. Моторова, Н. С. Система земского самоуправления на территории белорусских губернии: функции и структура / Н. С. Моторова // Ученые записки : сборник научных трудов / ВГУ им. П. М. Машерова. 2016. Т. 21. С. 25-29.
27. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861-1914 г.)/ А. Г. Каханоўскі. Мінск: БДУ, 2013. – 333 с.
28. Кузьмин, А. Д. Социокультурный облик чиновчничества белорусских губерний (1864-1914 г.) / А.Д. Кузьмин. Могилев: МГУП, 2017. – 187 с.
29. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения, 1802-1917 : справочник / сост.: Т. Е. Леонтьева, Д. Л. Яцкевич ; редкол.: А.К. Голубович [гл. ред.] и др. Минск: Бел НИИДАД, 2009. – 524 с.
30. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793-1917)/ сост. Т.Е. Леонтьева. Минск. БелНИИДАД, 2006. – 392 с.
31. Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1772-1917) / Анищенко Е.К. и др.; сост. Ю.Н. Снапковский, Д.Л. Яцкевич ; редкол. : Д.В. Яцевич (глав. ред.) Минск: Беларусь, 2014. – 814 с.
32. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772-1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск : Беларуская навука, 2018. – 573 с.
33. История белорусской государственности. В 5 т. Т. 2. Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в.) / Н. В. Смехович [и др.] ; отв. ред. тома. Н. В. Смехович, А. В. Унучек, Е. Н. Филатова ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. Минск : Беларуская навука, 2019. – 413 с.

УДК 355.40(470):930(476) «18/19»

# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ РОССИЙСКОЙ РАЗВЕДКИ И КОНТРРАЗВЕДКИ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ В XIX – НАЧАЛЕ XX В.: ИСТОРИОГРАФИЯ ВОПРОСА

**А.М. Лукашевич**

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь; lukashevand@mail.ru*

Анализируется проблема отражения в научной литературе деятельности на белорусских землях российских служб разведки и контрразведки в XIX – начале XX в. Отмечается, что наиболее изученным аспектом является деятельность на белорусских землях структур разведки и контрразведки в эпоху наполеоновских войн. В то же время дополнительного изучения требуют вопросы деятельности российской разведки в 1815–1914 гг., а также военной контрразведки в годы Первой мировой войны.

***Ключевые слова:*** разведка; контрразведка; историография; наполеоновские войны; Первая мировая война; Беларусь; Российская империя.

# THE ACTIVITY OF RUSSIAN INTELLIGENCE AND COUNTERINTELLIGENCE ON BELARUSIAN LANDS IN THE XIX – BEGINNING OF THE XX TH CENTURY: HISTORIOGRAPHY

**A.M. Lukashevich**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus; lukashevand@mail.ru*

Analyzes the problem of the reflection in the scientific literature of the activities on the Belarusian lands of the Russian intelligence and counterintelligence services in the 19th – early 20th centuries. It is noted that the most studied aspect is the activity on the Belarusian lands of intelligence and counterintelligence structures in the era of the Napoleonic Wars. At the same time, questions of the activities of Russian intelligence in 1815–1914, as well as military counterintelligence during the First World War, require additional study.

***Key words:*** intelligence; counterintelligence; historiography; Napoleonic wars; World War I; Belarus; Russian empire.